# ТРЭЦЯЕ ПАСЛАННЕ СВЯТОГА ЯНА

### Прывітанне

**1** 1Старэйшына – умілаванаму Гаю, якога я люблю ў праўдзе.

2Умілаваны, малюся, каб ты быў здаровы і каб ва ўсім шчасціла табе, як
шчасціць твёй душы. 3Я вельмі ўзрадаваўся, калі прыйшлі браты і засведчылі
пра тваю праўду і што ты паступаеш па праўдзе. 4Для мяне няма большай
радасці, як чуць, што мае дзеці жывуць у праўдзе.

### Пахвала Гая

5Умілаваны, ты паступаеш згодна з вераю ў тым, што робіш для братоў і
чужаземцаў. 6Яны засведчылі перад Касцёлам пра тваю любоў. Калі адправіш
іх па-Божаму, добра зробіш. 7Бо дзеля імя Хрыстовага яны пайшлі, нічога не
беручы ад язычнікаў. 8Таму мы павінны прымаць такіх людзей, каб стаць
супрацоўнікамі праўды.

### Заклік да еднасці і здзяйснення дабра

9Я напісаў ужо Касцёлу, але Дыятрэф, што любіць першынство сярод іх, не
прымае нас. 10Таму, калі прыйду, узгадаю яго ўчынкі, якія робіць, зласловячы
нас. Не задавольваючыся гэтым, і сам не прымае братоў, і забараняе тым, хто
хоча прымаць, ды выганяе іх з Касцёла.

11Умілаваны, не наследуй зло, але дабро. Хто чыніць дабро, той ад Бога, а
хто чыніць зло, той не бачыў Бога.

12Пра Дэметрыя ўсе сведчаць, нават сама праўда. І мы сведчым, а ты ведаеш,
што сведчанне нашае праўдзівае.

### Заканчэнне

13Пра многае меў напісаць табе, але не хацеў пісаць атрамантам і пяром, 14бо
спадзяюся хутка ўбачыць цябе і паразмаўляць з табою.

15Спакой табе. Вітаюць цябе сябры. І ты прывітай сяброў паіменна.

© Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, Мінск 2017